УДК 633.2.03|003.13

Г. В. ДРАБУДЗЬКА, А. П. КАЗЛОВА, Г. В. НІЧЫПЯРОВІЧ

ЭНЕРГЕТЫЧНЫ КРЫТЭРЫЙ У АЦЭНЦЫ ЭФЕКТЫЎНАСЦІ ВЫРОШЧВАННЯ ШМАТГАДОВЫХ ТРАЎ

Ва ўмовах рэспублікі асноўнай крыніцай паступлення кармоў з'яўляюцца ворныя ўгоддзі, на долю якіх прыпадае каля 80% усіх кармоў. Праблема павелічэння кармавых рэсурсаў і павышэння іх якасці звязана з далейшай інтэнсіфікацыяй кормавытворчасці, забеспячэннем высокай урадлівасці глебы і ўдасканаленнем вытворчых тэхналогій. Усё гэта патрабуе павелічэння энергетычных затрат. У сувязі з гэтым прапануецца супастаўляць энергетычныя затраты на вырошчванне ўраджаю кармавых культур (сельскагаспадарчая тэхніка, угнаенні, пестыцыды, жывая праца і г. д.) з абменнай энергіяй корму, якая выкарыстоўваецца арганізмам жывёлы для забеспячэння жыццёвых працэсаў і прадукцыйнасці.

Аснову палявой кормавытворчасці рэспублікі складаюць шматгадовыя травы, удзельная вага якіх у структуры пасяўных плошчаў калгасаў і дзяржгасаў у апошнія гады павялічылася. У 1990 г. шматгадовыя травы займалі 25,4% ворнай зямлі.

На аснове палявых доследаў, выкананых на эксперыментальнай базе «Жодзіна» ў 1988—1990 гг. пад кіраўніцтвам доктара сельскагаспадарчых навук П. І. Ніканчыка, была праведзена параўнальная ацэнка энергетычнай эфектыўнасці вырошчвання розных відаў шматгадовых траў і іх сумесей. Тэхналогія вырошчвання культур агульнапрынятая. Восенню пад усе культуры былі ўнесены мінеральныя ўгнаенні ў дозе